ГІСТОРЫЯ ПАРТЫЗАНСКАЙ СПЕЦАПЕРАЦЫІ 5



ДЗЕЦІ І ЭЛЕКТРОННЫЯ ПРЫЛАДЫ 8

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

24 ЛІПЕНЯ 2019 г. СЕРАДА № 137 (29004)

ЦЫТАТА ДНЯ

Анатоль ДАШКО, член Пастаяннай камісіі па працы і сацыяльных пытаннях Палаты прадстаўнікоў:

«Законапраект «Аб змяненні законаў па пытаннях аплаты працы работнікаў бюджэтных арганізацый» будзе разгледжаны Палатай прадстаўнікоў на восеньскай сесіі. Дакумент прыводзіць беларускае заканадаўства ў адпаведнасць з Указам ад 18 студзеня 2019 года № 27 «Аб аплаце працы работнікаў бюджэтных арганізацый». У ліку новаўвядзенняў — аднаразовая выплата на аздараўленне ў памеры паловы акладу. Дапамогу можна будзе атрымліваць раз на год да адпачынку. Акрамя таго, пашыраюцца паўнамоцтвы галіновых міністэрстваў і кіраўнікоў на месцах. Дзяржаўным органам і бюджэтным арганізацыям даецца права самастойна ўстанаўліваць памер выплат работнікам у залежнасці ад вынікаў працы і наяўнасці сродкаў. Гэта дазволіць дыферэнцыраваць зарплату кожнага канкрэтнага работніка».

РАЗМОВА НА РОЎНЫХ

Індык па мянушцы Федзя, які гадуецца ў аграсядзібе «Запаведны востраў», што ў Глыбоцкім раёне, вельмі свавольны, цікаўны і любіць «пабалбатаць» з турыстамі і з гаспадарамі — асабліва з Юрыем СТАРЦАВЫМ (*на фота*), які корміць і даглядае гэтую далікатную і важную «персону». Дзякуючы намаганням Юрыя Уладзіміравіча, на аграсядзібе створана жывёльна-птушыная ферма, у якой вольна, утульна і, вядома, сытна ўтрымліваюцца розныя пароды трусоў, авечак, коз, ліс-чарнабурак, некалькі відаў качак, курэй-цацарак і фазанаў. Юрый заўсёды сам праводзіць экскурсіі для наведвальнікаў аграсядзібы і ў першую чаргу знаёміць з індыком Фёдарам.

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.

КАРАТКА

- **Нафтаправод Унеча—Полацк поўнасцю ачышчаны ад бруднай нафты.**
- Дні культуры Узбекістана ў Беларусі пройдуць з 29 ліпеня да 1 жніўня ў Мінску і Бабруйску.
- **Новы мікраараён пачнуць узводзіць у Пінску ў канцы года.**
- Археолагі БДУ знайшлі каля вёскі Яскавічы Салігорскага раёна больш за дзве тысячы артэфактаў II—IV стагоддзяў н. э. Сярод іх упрыгажэнні канца II—IV стагоддзяў, сярэбраны дынарый рымскага імператара Луцыя Вера (166 год).

ISSN 1990 - 763X

Даследуем праблему

ВЫЖЫВУЦЬ САМЫЯ МОЦНЫЯ

Як развіваецца прыдарожны сэрвіс?

Дарогі — візітная картка краіны. Пры гэтым для таго, каб наша з вамі паездка была прыемнай, важная не толькі якасць дарожнага пакрыцця, але і шмат што іншае. Напрыклад: далёка да наступнай запраўкі і ці працуе яна сёння? Ці адкрыты прадуктовы магазін і ці ўладкаваны туалет на гэтай запраўцы? Ці ёсць там матэль і колькі каштуе начлег? Для таго каб нашы дарогі станавіліся больш прывабныя і зручныя для кіроўцаў і аўтатурыстаў, Міністэрства транспарту і камунікацый цяпер распрацоўвае генеральную схему развіцця прыдарожнага сэрвісу да 2025 года.

«Беларусы, вы што, развучыліся гатаваць?»

Тыповы беларускі аб'ект прыдарожнага сэрвісу часцей за ўсё ўяўляе сабой аўтазаправачную станцыю (АЗС) з невялікай крамай. І гэта менавіта тое, чаго чакае большасць аўтатурыстаў.

Нядаўна Мінтранс правёў апытанне і выявіў патрэбы кліентаў прыдарожнага сэрвісу. Як аказалася, асноўнае патрабаванне — гэта наяўнасць аўтазапраўкі (92 % апытаных). Далей у спісе пераваг ідуць санітарныя паслугі, харчаванне (52 %), пляцоўкі для адпачынку (31 %), паркоўка для аўто. Акрамя таго, аўтатурысты маюць патрэбу ў спадарожных паслугах, напрыклад наведванні крамы (30 %). А 4 % апытаных хацелі б, каб на аб'екце прыдарожнага сэрвісу была і гасцініца.

СТАР. 9

Клімат

Мы не згарым ад сонца і не патонем ад дажджу

Але так цёпла бывае раз на 30 гадоў

Менавіта так адказала начальнік аддзела вывучэння змяненняў клімату службы метадычнага забеспячэння гідраметэаралагічных назіранняў, вывучэння змяненняў клімату і фонду даных Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды Наталля КЛЯВЕЦ на пытанне, якіх катаклізмаў нам чакаць у найбліжэйшыя гады... У нас дастаткова ўмераны клімат, таму нейкіх складаных сінаптычных змяненняў, звязаных з крытычнымі тэмпературамі, не чакаецца, удакладніла спецыяліст.

СТАР. 12

Фота БелТА.

«З ПАЛЁЎ МЫ ПАВІННЫ ЎЗЯЦЬ 9,5 МІЛЬЁНА ТОН»

Прэзідэнт правёў селектарную нараду па ўборачнай кампаніі

Сельская гаспадарка — адна з асноўных галін нашай эканомікі, і зараз для яе наступіла самая гарачая і адказная пара — уборка ўраджаю. Ад таго, наколькі нашым аграрыям удасца хутка, своечасова і якасна, без страт, сабраць вырашчанае, а потым падрыхтаваць палеткі пад новыя пасевы, залежыць цэлы год жыцця краіны. Аляксандр Лукашэнка правёў селектарную нараду з кіраўнікамі абласцей па пытаннях уборкі ўраджаю, каб своечасова сфармуляваць задачы перад выканаўчай уладай і выслухаць з боку кіраўніцтва рэгіёнаў пытанні, якія іх найбольш хвалююць у гэты адказны час.

Прэзідэнт паведаміў, што ў тэхналагічным плане ўборачная кампанія будзе няпростая: большасць пасеваў — высакарослыя, з добрай шчыльнасцю, але асцярогу выклікае «яруснасць» паспявання, яе «неаднароднасць» на адным полі.

Уборка збожжавых культур сёлета пачалася на дзесяць дзён пазней, чым звычайна. Таму Аляксандр Лукашэнка запатрабаваў завяршыць яе пераважна за два тыдні і не пазней за дваццаць дзён.

Прыярытэтам кіраўнік дзяржавы назваў уборку збожжавых, але наказаў паралельна паклапаціцца пра нарыхтоўку травяністых кармоў: другі ўкос шматгадовых траваў і масавую сяўбу пажніўных культур. Адначасова неабходна ўбраць лён.

«Самы жорсткі кантроль па льне і сур'ёзны кантроль па рапсе. Рапс — высокадаходная культура, вельмі рэнтабельная ўжо пры ўраджайнасці 15 цэнтнераў з гектара. Вы сёння маеце азімага рапсу 20 цэнтнераў», — звярнуўся да ўдзельнікаў нарады кіраўнік краіны.

Ён адзначыў, што такі звышнапружаны графік работ у гарачую пару бывае рэдка. Разлікі на ўраджай неблагія, валавы збор па ўсіх культурах прагназуецца вышэй за леташні. Трэба задзейнічаць усе наяўныя рэзервы.

«З палёў мы павінны ўзяць 9,5 мільёна тон — і рапс, і кукурузу на зерне, і каласавыя, і грэчку, і проса, — усё. Ніжэй за дзевяць нельга», — паставіў задачу Аляксандр Лукашэнка.

Па яго словах, залог поспеху — дакладная арганізацыя працы, высокая працоўная і тэхналагічная дысцыпліна. Аднак кантрольныя органы па-ранейшаму выяўляюць шмат недахопаў, недапрацовак — тое, што Прэзідэнт назваў «адкрытым галавацяпствам», — а часта — прыпіскі. І гэта кіраўніка дзяржавы насцярожвае — як і недахоп механізатараў, непадрыхтаваныя тэхніка і зернесушыльныя комплексы, складанасці з палівам: запасы на складах сельскагаспадарчых арганізацый і райаграсэрвісаў забяспечваюць работу на палях толькі на чатыры дні.

Адказнасць за паліва Аляксандр Лукашэнка ўсклаў на ўрад краіны. Якое рэальнае становішча з уборкай на месцах? Чаму не забяспечаная падрыхтоўка тэхнікі і зернесушыльнай гаспадаркі? І адкуль дэфіцыт паліва, калі ўсе рашэнні па ім прынятыя? На гэтыя пытанні Прэзідэнт запатрабаваў адказ у старшынь абласных выканаўчых камітэтаў падчас селектарнай нарады, адзначыўшы, што яму патрэбная аб'ектыўная інфармацыя.

На Брэстчыне ўбралі амаль палову ўраджаю

У Брэсцкай вобласці ўборка ідзе запланаванымі тэмпамі, на ўзроўні мінулага года, далажыў Прэзідэнту **старшыня аблвыканкама Анатоль ЛІС.** На ўчарашнюю раніцу ўбрана 43 % плошчаў пры ўраджайнасці 35,8 цэнтнера з гектара, што больш за леташні ўзровень на восем цэнтнераў. Паўднёвыя раёны вобласці, якія здолелі ўбраць ужо 60—70 % збажыны, дапамогуць паўночным. На Брэстчыне вырвана больш за 80 % лёну, пачата перапрацоўка трасты.

«Лічу, справімся з уборкай у намечаныя тэрміны. Нам неабходны два тыдні для завяршэння работы», — праінфармаваў Прэзідэнта губернатар.

Аляксандр Лукашэнка наказаў звярнуць сур'ёзную ўвагу на якасць уборкі.

«Мы ўвесь час кажам: плошчы, працэнты... Паглядзіце, што робіцца пасля ўборкі. Страты вазьміце на кантроль — сёння можна адрэгуляваць камбайны і не дапусціць страт. Каля паўмільёна тон пакідаем на палях, а гэта добры аб'ём», — заўважыў кіраўнік дзяржавы губернатарам, асабліва цэнтральных і паўднёвых рэгіёнаў. Аляксандр Лукашэнка нагадаў пра запас кармоў, якога павінна хапіць на паўтара-два гады. Паколькі летась шмат кармоў расходавалі, трэба аб'ёмы папоўніць.

«Наперадзе яшчэ два месяцы — сена не паспее, а сянаж будзе. А наракаць на надвор'е нельга, наш паратунак, што прайшлі дажджы», — адзначыў Прэзідэнт.

Гомельшчына скончыць жніво за два тыдні

Першы намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама Генадзь САЛАВЕЙ праінфармаваў, што аграрыі Гомельскай вобласці ўбралі больш за 30 % плошчаў пасеваў і атрымалі 237 тысяч тон збожжа. Для забеспячэння патрэбнасці ў кадрах дадаткова прыцягнута 633 механізатары з іншых арганізацый. Сельскагаспадарчыя арганізацыі палівам забяспечаныя.

На Гомельшчыне ўраджайнасць убранага рапсу склала 10,7 цэнтнера з гектара — паказчык, які не задаволіў кіраўніка краіны.

«Дзесяць цэнтнераў рапсу — гэта страты. Не расце рапс — не вырошчвайце яго. Дакладней, сёння ў Гомельскай вобласці няма стратных культур, якія вырошчваюцца. Ёсць парушэнне тэхналагічнай дысцыпліны і падбору адпаведных глеб. Трэба думаць, як будзеце дзейнічаць заўтра. Адзіны ратунак папаўнення зерневага балансу — кукуруза. Не атрымаеце бялку — не будзеце ведаць, чым карміць свіней і птушку», — перасцярог Аляксандр Лукашэнка.

«Па збожжы бачым, што за два тыдні справімся. Змянілі структуру пасяўных плошчаў: дзе бачылі праблемы з яравымі збожжавымі, павялічылі пасевы кукурузы больш чым на 15 %», — растлумачыў Генадзь Салавей.

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што за структуру пасяўных плошчаў Гомельшчыны па большай частцы адказвае былы губернатар, віцэ-прэм'ер Уладзімір Дворнік. А наконт надвор'я зноў нагадаў: клімат змяніўся, асабліва на Брэстчыне і Гомельшчыне. Новая сітуацыя патрабуе планавання, што, дзе і як сеяць.

Гродзеншчына: лён добры, па збожжы адстаюць

Як паведаміў **старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір КРАЎЦОЎ,** усе гаспадаркі вобласці распачалі ўборку: убрана каля 22 % плошчаў збожжавых і зернебабовых. Лічба выклікала крытыку з боку Аляксандра Лукашэнкі.

«Правальваеце па тэмпах. Гродна ніколі так у хвасце не плялося, як зараз: нават Гомельскай вобласці па тэмпах саступаеце. 20 % — не вашы тэмпы. Калі ў вас там вырашчаны «шалёны» ўраджай — яго трэба сабраць», — хуткасць уборачнай кампаніі на Гродзеншчыне насцярожыла кіраўніка краіны, бо, упэўнены ён, там ёсць усё, каб у час і якасна ўбраць ураджай.

Уладзімір Краўцоў паведаміў, што збожжа і кукурузы гродзенцы плануюць сабраць 1600 тысяч тон. На палях такія аб'ёмы ёсць, убраць іх можна. І яны дазволяць нармальна прайсці асеннезімовы перыяд у жывёлагадоўлі.

«У вас на палях 1900, ну, калі 1850 атрымаеце, — малайцы», — не згадзіўся з кіраўніком вобласці Прэзідэнт.

На Гродзеншчыне практычна ўбралі рапс, сабраўшы 157 тысяч тон (у паўтара раза больш за леташні вынік), з ураджайнасцю каля 30 цэнтнераў з гектара.

Аграрыі вобласці вырасцілі неблагі лён і вырвалі ўжо каля 65 %, частка ўжо апрацоўваецца на заводах. Заданні па льне плануюць выканаць — вырабіць сем тысяч тон якаснага льновалакна.

На просьбу губернатара аб крэдыце на набыццё тэхнікі Аляксандр Лукашэнка адказаў, што прапанаваная «нармальная схема» будзе ўсяляк падтрымана, а прыклад будзе перанесены на іншыя вобласці. Прэзідэнт звярнуў асаблівую ўвагу на захаванасць тэхнікі.

«Фермеры бяруць 10-гадовыя камбайны і яшчэ дзесяць гадоў іх эксплуатуюць — захоўваюць сваё. Міліцыя ўвагу, канешне, зверне, але хацелася б, каб вы былі завадатарам гэтага кантролю. Будзе добрая захоўваемасць, будзе і падтрымка. Але крэдытаванне, зразумела, зваротнае. Што, будзем ва ўрачоў, настаўнікаў і пенсіянераў забіраць?» — задаў пытанне кіраўнік краіны.

Міншчына: дабавіць хуткасці

«Усе раёны Міншчыны прыступілі да ўборкі, — далажыў **старшыня Мінскага абласнога выканаўчага камітэта Анатоль ІСАЧАНКА.** — Трэба ўбраць 505 тысяч гектараў збожжавых і зернебабовых культур, што на 35 тысяч гектараў больш, чым летась. Убрана 18 %, намалочана 308 тысяч тон, ураджайнасць 34 цэнтнеры з гектара».

Цэнтральны рэгіён практычна завяршыў уборку рапсу, валавы аб'ём якога чакаецца 185 тысяч тон, што на 75 тысяч тон больш, чым летась. Ва ўборцы збожжавых будуць удзельнічаць 2000 адзінак збожжаўборачных камбайнаў, 560 зернесушыльных комплексаў, каля 2000 машын. «Гэтая тэхніка нам дазволіць завяршыць уборку збожжавых за 20 пагодлівых дзён, — запэўніў губернатар. — Для пастаяннай гатоўнасці маецца рэзерв запасных частак. Улічваючы спецыфіку вобласці, мы ўжо сёння плануем перакідку камбайнаў па суседніх раёнах з тым, каб пазбегнуць доўгіх перагонаў».

На палях Міншчыны ў найбліжэйшыя тры тыдні будзе працаваць больш за восем тысяч механізатараў, у тым ліку жыхары сталіцы.

У вобласці распачата ўборка льну. Першыя вынікі паказваюць больш высокую яго якасць, чым летась. Працягваецца нарыхтоўка кармоў і падрыхтоўка да азімай сяўбы.

Анатоль Ісачанка звярнуўся да Прэзідэнта з просьбай разгледзець пытанне адносна запазычанасці гаспадарак за паліва. «Нам засталося каля 8 мільёнаў, каб пагасіць, мы гэтыя грошы аддадзім, але, з улікам падаражання паліва нам гэты крэдыт абыходзіцца пад 20 % гадавых. Канешне, гэтая сума вялікая, у прыватнасці, па Мінскай вобласці — 5 мільёнаў 600 тысяч нам дадаткова трэба знайсці сродкаў, каб разлічыцца па таварным крэдыце», — растлумачыў губернатар.

Аляксандр Лукашэнка паабяцаў, што прэм'ер-міністр неадкладна прыступіць да вырашэння пытанняў з палівам. «Трэба дапамагчы, значыць трэба», — сказаў ён.

Пры гэтым звярнуў увагу кіраўніка вобласці на тое, што на Міншчыне самыя вялікія аб'ёмы ўборкі. «Таму тут пытанне якасці не здымаецца, але патрэбна яшчэ і хуткасць, — сказаў ён. — І для гэтага ў вас усё ёсць».

На Віцебшчыне вырошчваюць цуда-жыта

Як далажыў Прэзідэнту **губернатар Віцебшчыны Мікалай ШАРСНЁЎ,** 354 тысячы гектараў плануюць убраць сельскія гаспадаркі вобласці — на 54 тысячы больш, чым летась. Сёння ў паўночным рэгіёне ўбрана 5 % плошчаў, атрымана ўраджайнасць 30,1 цэнтнера з гектара.

На ўчарашнюю раніцу на Віцебшчыне заставалася ўбраць пяць тысяч гектараў азімага рапсу. Ураджайнасць зернебабовых сёлета павялічылася на 4,5 цэнтнера, але засталася нізкай — 14,5 цэнтнера з гектара. Між тым на асобных палетках, дзе дакладна вытрымана тэхналогія, аграрыі атрымліваюць і 30 цэнтнераў.

«Вырвана 26 % лёну, становішча па гэтай культуры вельмі адрозніваецца па асобных раёнах вобласці. У цэлым спадзяёмся, што валакна будзе больш, чым летась», — адзначыў Мікалай Шарснёў.

Нарыхтоўку кармоў на Віцебшчыне не спыняюць. Асноўнай задачай на жнівень кіраўнік вобласці бачыць узворванне каля 15—20 тысяч гектараў зямлі, што дазволіць атрымаць дадатковую прадукцыю раслінаводства.

У Віцебскай вобласці пяты год працуюць з гібрыдным жытам, плошчу пасеву якога селёта павялічылі да 10 тысяч гектараў.

«Дае найцудоўнейшы ўраджай, і сёлета ўраджайнасць каля 70—80 цэнтнераў з гектара — нават калі сярэдне вытрымаць тэхналогію», — падкрэсліў губернатар.

Аляксандр Лукашэнка даручыў зацікаўленым наведаць Віцебскую вобласць і пазнаёміцца з культурай, якая яго таксама ўразіла.

Магілёўшчыне патрэбна іншая структура пасеваў

Усе раёны Магілёўскай вобласці таксама прыступілі да ўборкі. На 15 працэнтах плошчы збажына ўжо абмалочана, далажыў **старшыня Магілёўскага аблвыканкама Леанід ЗАЯЦ.** Збожжаўборачны парк гатовы выканаць задачу своечасова. «Што датычыцца валавога намалоту збажыны, мы чакаем 1 мільён 150 тысяч тон, на 25 працэнтаў вышэй за ўзровень мінулага года, — сказаў ён. — У асноўным збожжа на 30—40 працэнтаў убрана на лёгкіх землях: Слаўгарадскі, Асіповіцкі, Глускі раёны. Ураджайнасць 26 цэнтнераў з гектара. Мы чакаем, што атрымаем больш збожжа са Шклоўскага, Мсціслаўскага, Горацкага, Магілёўскага раёнаў».

Губернатар прызнаўся, што ў Магілёўскай вобласці патрабуецца карэнная змена структуры пасяўных плошчаў. У раёнах, якія размешчаны на лёгкіх землях, у структуры збожжа не менш за 70 працэнтаў павінны займаць азімыя культуры, лічыць ён. Для гэтага кіраўніцтва вобласці вядзе актыўны пошук насення, ачышчае зямлю ад пустазелля, прымае меры для забеспячэння гаспадарак мінеральнымі ўгнаеннямі, вывазу арганічных угнаенняў. Плошчы азімых збожжавых, а таксама азімага рапсу і свірэпіцы ў рэгіёне будуць расшыраны.

Вобласць сёлета падвоіла пасевы кукурузы на зерне і чакае валавы ўраджай больш за 200 тысяч тон, частка якога будзе высушана для корму птушкі і свіней, астатняя маса будзе плюшчыцца і закладвацца ў рукавы на захоўванне.

«Я рады, што вы тыя дамоўленасці, якія ў нас былі дасягнутыя, вытрымліваеце, — пракаментаваў даклад кіраўніка вобласці Аляксандр Лукашэнка. — Гэта кажа пра тое, што вы ўсё ж такі даб'яцеся пералому ў Магілёўскай вобласці і, магчыма, станеце там гістарычнай асобай... Прыемна, што вы разумееце, што там трэба рабіць».

Кіраўнік дзяржавы таксама нагадаў губернатару пра эксперыментальныя палі ў Гомельскай вобласці, якія былі закладзены, калі Леанід Заяц быў міністрам сельскай гаспадаркі і харчавання. «Паглядзіце гэтыя палі і зрабіце высновы, — загадаў Аляксандр Лукашэнка. — Дзе і як можна вырошчваць збожжавыя пры правільнай тэхналогіі».

Мінск: рапс убраны напалову

У зоне адказнасці Мінгарвыканкама — 26 гаспадарак і яшчэ пяць, створаных сёлета па даручэнні Прэзідэнта. **Старшыня Мінскага гарвыканкама Анатоль СІВАК** паведаміў, што ўсе прадпрыемствы прыступілі да ўборкі ўраджаю. Рапсу ўбралі амаль палову — 47 % плошчаў, атрымаўшы ўраджайнасць 22,4 цэнтнера з гектара. Абмалацілі 16 % плошчаў збожжавых, сабраўшы 31,2 цэнтнера з гектара.

«Зробім так, што сельская гаспадарка, за якую адказваем, будзе з добрым вынікам, прынамсі па тэрмінах і па якасці. Камбінат хлебапрадуктаў пачаў закупаць дзяржзаказ — ужо пастаўлена 14 тысяч тон збожжа з розных абласцей; рыхтуемся да закупак іншай прадукцыі», — праінфармаваў Анатоль Сівак.

Ён нагадаў, што прасіў урад павялічыць дзяржзаказ. Прэзідэнт просьбу падтрымаў.

План па збожжы павінен быць выкананы

«Жалезабетонна. Планы — 8672 тысячы тон збожжавых і зернебабовых. Не сем ці сем з паловай! Рапсу — 766,3 тысячы тон, льновалакна — 52,6 тысячы тон, цукровых буракоў каля пяці мільёнаў сёлета атрымаць, кукурузы на зерне 1717 тысяч тон — не паўтара мільёна. А два мільёны — тое, да чаго вы павінны імкнуцца, гэта будзе ваш подзвіг. Бульбы 1100 тысяч тон і агародніны каля 600 тысяч тон. Вось вашы планы па земляробстве, калі ласка, выканайце іх», — звярнуўся да ўдзельнікаў нарады Прэзідэнт.

Ён перасцярог ад празмернага кантролю не там, дзе трэба: справа гаспадарак, колькі камбайнаў прыцягнута да ўборкі ўраджаю. Сачыць трэба за выкананнем асноўных паказчыкаў: дзяржзаказам, нарыхтоўкай, якасцю.

Асобна ён спыніўся на выкарыстанні новых тэхналогій у сельскай гаспадарцы.

«Палімерная плёнка і рулонны прэс — выратаванне не толькі пры нарыхтоўцы травяністых кармоў, гэта выратаванне для гультаёў. Траву скасіў, скруціў у плёнку, унёс кансервант. Паляжыць гэты рулон на полі, калі не можаш своечасова звезці. Але гэта ўжо кармы, і добрыя. Усе рулонныя прэсы павінны быць задзейнічаны на поўную магутнасць», — загадаў кіраўнік дзяржавы, тым больш што вытворчасць палімернай плёнкі ў краіне асвоеная.

Пытаннем № 1 Аляксандр Лукашэнка назваў тэхналогію нарыхтоўкі і захавання кукурузнага зерня. «Мы ведаем, як гэта рабіць: паліэтыленавыя рукавы. Плюшчыце кукурузу і закладаеце ў рукавы. Рукавы вырабляем у краіне, плюшчылкі маем, дэфіцыту няма. У рукавы ці адмысловыя траншэі. Будзе танней, чым сушыць. Але птушкам патрэбная сухое зерне», — даў наказ Прэзідэнт. Ён адзначыў, што гэты год павінны стаць пераломным для сельскай гаспадаркі. Але без дысцыпліны нічога зрабіць не ўдасца, таму з п'яніцамі і гультаямі разбірацца будуць самым жорсткім спосабам.

«Трэба дапамагчы кіраўнікам. Гаворкі, што рынак усё адрэгулюе, свабода, як хачу — так і кручу, яны нас прывядуць не туды. Мы гэта ўжо адчулі ў нашым жыцці», — падвёў вынік нарады Прэзідэнт.

Варвара МАРОЗАВА,
Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

Да ведама

Выхадная дапамога — сярэднямесячны заробак

У Працоўным кодэксе пашыраныя сацыяльна-працоўныя гарантыі работнікаў

Прэзідэнт падпісаў закон «Аб змяненні законаў», якім уносяцца змяненні ў Працоўны кодэкс. Прыняцце закона накіравана на стварэнне ўмоў для эфектыўнай і гібкай занятасці грамадзян і пашырэнне сацыяльна-працоўных гарантый работнікаў.

Дакументам прадугледжана рэгуляванне парадку часовага пераводу са згоды работніка на іншую работу, у тым ліку да іншага наймальніка.

Памер выхадной дапамогі павялічаны да адной сярэднямесячнай заработнай платы, калі звальненне работніка адбылося з прычыны ўстанаўлення няпоўнага рабочага часу (менш за палавіну нормы).

Установлены месячны тэрмін папярэджання работніка аб змяненні істотных умоў працы. Дадзена магчымасць працаваць па сумяшчальніцтве поўны рабочы дзень або змену ў перыяд працоўнага водпуску.

Навацыяй закона з'яўляецца ўключэнне ў Працоўны кодэкс новай главы, якая рэгулюе адносіны работніка і наймальніка пры выкананні дыстанцыйнай работы. Прымяненне гэтай формы працоўных адносін стала магчымае дзякуючы развіццю інфармацыйных тэхналогій. Дыстанцыйная работа зручная для абодвух бакоў працоўных адносін. Наймальніку не трэба абсталёўваць рабочае месца, а супрацоўнік можа выконваць работу ў любым месцы, дзе яму зручна.

Замацоўваюцца дадатковыя сацыяльна-працоўныя гарантыі. Гэта, напрыклад, даванне татам па іх жаданні водпуску (да 14 каляндарных дзён) пры нараджэнні ў сям'і дзіцяці. У мэтах забеспячэння працоўных правоў работнікаў закон прадугледжвае, што па пагадненні бакоў працоўны кантракт з работнікам, які не дапускае парушэнняў дысцыпліны, будзе прадаўжацца да заканчэння максімальнага тэрміну яго дзеяння. А новы кантракт з такім работнікам будзе заключацца на тэрмін, не меншы за тры гады. На меншыя тэрміны кантракты будуць прадаўжацца і заключацца новыя толькі з пісьмовай згоды работніка.

Акрамя таго, у Працоўным кодэксе замацаваны нормы, якія прадугледжваюць, што матэрыяльная адказнасць будзе надыходзіць аднолькава і для тых, хто працуе па кантракце, і для тых, хто па працоўным дагаворы, толькі за наўмыснае прычыненне маёмаснай шкоды.

Закон уступіць у сілу праз шэсць месяцаў пасля яго афіцыйнага апублікавання.

За схіленне да допінгу пакараюць

У Беларусі змяняецца Крымінальны кодэкс

Аляксандр Лукашэнка падпісаў закон «Аб змяненні Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь».

У мэтах удасканалення крымінальнага заканадаўства з улікам практыкі яго прымянення, забеспячэння строгай адпаведнасці ступені цяжару асобных дзеянняў і мер адказнасці, якія прымяняюцца за іх, законам прадугледжваецца скарачэнне ніжняй мяжы пакарання за незаконны абарот наркотыкаў (артыкул 328 Крымінальнага кодэкса).

Пры гэтым тэрмін пазбаўлення волі па ч. 2 гэтага артыкула ўстанаўліваецца ад 3 да 8 гадоў, а па ч. 3 — ад 6 да 15 гадоў (да прыняцця закона — адпаведна ад 5 да 8 і ад 8 да 15 гадоў).

Карэкціроўка Крымінальнага кодэкса дасць магчымасць судам у кожным канкрэтным выпадку больш выбарачна падыходзіць да назначэння пакаранняў за злачынствы, звязаныя з абаротам наркотыкаў, з улікам усіх абставін іх учынення.

Таксама законам у рамках процідзеяння асобным відам пагроз грамадскай бяспецы, актуальным на сучасным этапе, прадугледжана ўстанаўленне крымінальнай адказнасці за наўмысныя дзеянні па рэабілітацыі нацызму нараўне з распальваннем расавай або іншай сацыяльнай варожасці.

Уводзіцца крымінальная адказнасць за схіленне спартсмена да выкарыстання допінгу, а таксама за выкарыстанне ў адносінах да спартсмена без яго ведама забароненых рэчываў або метадаў.

Паводле БелТА.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Інцыдэнт з самалётамі Расійскай Федэрацыі і Паўднёвай Карэі над Японскім морам

Аб'яднаны Камітэт начальнікаў штабоў Паўднёвай Карэі заявіў аб парушэнні Расіяй паветранай прасторы краіны. Пра гэта паведамляе агенцтва «Ёнхап».

Па іх звестках, самалёт Паветрана-касмічных сіл Расіі два разы па тры хвіліны знаходзіўся ў паветранай прасторы Паўднёвай Карэі над Японскім морам у аўторак, 23 ліпеня.

Адзначаецца, што паўднёвакарэйскія знішчальнікі былі паднятыя па трывозе і зрабілі папераджальныя стрэлы. Часовы павераны ў справах Расійскай Федэрацыі ў Паўднёвай Карэі Максім Волкаў быў выкліканы ў МЗС рэспублікі, дзе яму была ўручана нота пратэсту ў сувязі з інцыдэнтам у паветры над Японскім морам.

У Мінабароны РФ заявілі, што два стратэгічныя бамбардзіроўшчыкі Ту-95МС, якія выконвалі планавы палёт, не парушалі межы іншых дзяржаў. Пры гэтым у ваенным ведамстве пацвердзілі, што паўднёвакарэйскія знішчальнікі перасякалі курс расійскіх ракетаносцаў, ствараючы пагрозу іх бяспецы, і не выходзілі на сувязь. Дзеянні паўднёвакарэйскіх пілотаў расійскія ваенныя назвалі непрафесійнымі.

Кабул запатрабаваў ад Вашынгтона растлумачыць словы Трампа пра вайну ў Афганістане

Улады Афганістана ў аўторак заклікалі прэзідэнта ЗША Дональда Трампа растлумачыць яго выказванне аб здольнасці ЗША выйграць вайну ў Афганістане ўсяго за некалькі дзён. Пра гэта паведаміў тэлеканал Tolo News са спасылкай на заяву адміністрацыі прэзідэнта.

«Афганскі народ не дазваляў і не дазволіць якой-небудзь замежнай дзяржаве вырашаць свой лёс. Мы падтрымліваем высілкі ЗША па ўстанаўленні міру ў Афганістане, але лёс краіны не можа быць вызначаны на сустрэчы замежных лідараў у адсутнасць афганскага кіраўніцтва», — падкрэсліваецца ў заяве. У дакументе адзначаецца, што ўлады Афганістана чакаюць ад Вашынгтона тлумачэнняў па дыпламатычных каналах адносна пазіцыі Трампа.

У панядзелак Дональд Трамп сустрэўся ў Белым доме з прэм'ер-міністрам Пакістана Імранам Ханам. На сустрэчы прэзідэнт ЗША заявіў, што Вашынгтон мог бы перамагчы ў вайне ў Афганістане на працягу некалькіх дзён, аднак не хоча «забіваць 10 мільёнаў чалавек».

Ельцын спрабаваў прадаць Карэлію?!

Расійскае кіраўніцтва ніколі не ставіла пытанне аб продажы Рэспублікі Карэлія Фінляндыі. Пра гэта выданню РБК заявіў былы дзяржаўны сакратар пры прэзідэнце Расіі Барысе Ельцыне Генадзь Бурбуліс.

«Ніколі такога быць не магло», — сказаў ён.

Пра тое, што ў Крамлі ў 1991 годзе абмяркоўвалася магчымасць адпаведнай здзелкі і нават яе меркаваная сума ў памеры 15 мільярдаў долараў, 21 ліпеня паведаміла фінская газета Helsingin Sanomat са спасылкай на тагачаснага намесніка міністра замежных спраў Расіі Андрэя Фёдарава. Той заявіў, што палітычнае кіраўніцтва Расіі працавала над гэтай тэмай «за зачыненымі дзвярыма». Ідэя продажу Карэліі паўстала ад недахопу сродкаў у расійскай казне, аднак ужо ў 1994 годзе гэтае пытанне было закрыта канчаткова, сцвярджае дыпламат.

Гендырэктар Расійскага савета па міжнародных справах Андрэй Картуноў у гутарцы з РБК адзначыў «крыху эпатажны» характар заявы Фёдарава і дадаў, што тэма продажу Карэліі магла абмяркоўвацца ў МЗС толькі ў рабочым рэжыме, але ні пра які продаж гаворкі не было. «І афіцыйна гэтае пытанне ніяк не ставілася», — падкрэсліў ён.

Трэба ведаць

Экзамены новага навучальнага года

Пастановай Міністэрства адукацыі ўстаноўлены формы правядзення выпускных экзаменаў у 2019/2020 навучальным годзе і пералік вучэбных прадметаў, па якіх яны будуць праводзіцца. Такая інфармацыя размешчана на сайце Нацыянальнага прававога інтэрнэт-партала, паведамляе БелТА.

Такім чынам, дзевяцікласнікі будуць здаваць тры пісьмовыя экзамены: беларускую і рускую мовы, а таксама матэматыку. Для навучэнцаў класаў, у якіх навучанне і выхаванне на другой ступені агульнай сярэдняй адукацыі вялося на мове нацыянальнай меншасці — польскай ці літоўскай, разам з гэтымі прадметамі абавязковай зацверджана польская ці літоўская мова ў пісьмовай форме.

У каледжах мастацтваў, сярэдніх школах-каледжах мастацтваў і гімназіях-каледжах мастацтваў дзевяцікласнікі разам з асноўнымі будуць здаваць адзін з вучэбных прадметаў на выбар. Экзамен будзе праводзіцца ў практычнай форме.

Адзінаццацікласнікі ў новым навучальным годзе будуць пісьмова здаваць матэматыку, беларускую мову або рускую мову на выбар. Вуснымі будуць экзамены па замежнай мове і гісторыі Беларусі. Вучні з класаў нацыянальных меншасцяў здаюць таксама пісьмовы экзамен па польскай або літоўскай мове. Адзінаццацікласнікі сярэдніх школ-каледжаў мастацтваў, гімназій-каледжаў мастацтваў трымаюць дадатковы практычны выпускны экзамен па выбары, накіраваны на развіццё іх творчых здольнасцяў.

Ведай нашых!

У ЕЎРОПЕ — ПЕРШЫ!

Беларус Аляксей Жарнасек заваяваў залаты медаль на чэмпіянаце Еўропы па водных лыжах за катарам, які прайшоў у Іспаніі.

Наш атлет, шматразовы чэмпіён і рэкардсмен свету, пацвердзіў свой клас у фігурным катанні, атрымаўшы 11 620 балаў. На другім радку падагульняючага пратакола размясціўся П'ер Балон з Францыі, а трэцяе месца заняў яго суайчыннік Луі Дзюплан-Фрыбург. У актыве беларускай каманды на турніры і серабро ў скачках з трампліна Ганны Стральцовай, якая паказала вынік 52,8 м. У суме мнагабор'я (фігурнае катанне, скачок з трампліна і слалам) Ганна Стральцова заняла другое месца, трэцяе — у яшчэ адной беларускі Аляксандры Данішэўскай.

У агульнакамандным заліку чэмпіянату зборная Беларусі заняла другое месца. Першае — у французскіх вадналыжнікаў.

Здарэнні

Нечаканая знаходка

З-за яе ў Драгічыне эвакуявалі 50 чалавек

Як паведамляецца на афіцыйным сайце УУС Брэсцкага аблвыканкама, інцыдэнт адбыўся ў аўторак раніцай у цэнтры горада.

У 10.02 у дзяжурную частку РАУС паступіла паведамленне ад работнікаў будаўнічай арганізацыі аб тым, што на дваровай тэрыторыі дома № 151 па вуліцы Леніна падчас земляных работ знойдзена мінамётная міна калібру 52 мм, як мяркуецца, часоў Вялікай Айчыннай вайны.

На месца здарэння неадкладна выехалі службы экстранага рэагавання. Патэнцыйна небяспечнае месца было ачэплена. З бліжэйшых будынкаў эвакуявалі 50 чалавек, быў выстаўлены пост з супрацоўнікаў міліцыі. З Брэста прыбыла група размініравання. Як высветлілася, снарад не меў у сабе зарада і ўжо не ўяўляў небяспекі. Мяркуецца, што міну завезлі на дваровую тэрыторыю разам з пяском.

ПЛАЦДАРМ
Сумесны праект рэдакцыі газеты «Звязда» і Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь
Выпуск № 7 (94)

Міністр абароны ўручыў Дзяржаўны сцяг удзельнікам Армейскіх міжнародных гульняў — 2019

АЛІМПІЯДА ПА-АРМЕЙСКУ

Беларускія байцы прайшлі ўвесь курс падрыхтоўкі, найлепшыя з найлепшых са складу Узброеных Сіл гатовыя ўступіць у вучэбны бой. Гэта адзначыў **міністр абароны Андрэй РАЎКОЎ** на цырымоніі ўручэння сцяга Беларусі.

«За плячыма — складаная праца, пот, мазалі. На завяршальнай стадыі вам неабходна паказаць, чаму ж вы навучыліся, што вы можаце. Вы будзеце прадстаўляць не толькі Узброеныя Сілы, але і Рэспубліку Беларусь. У кожнага з вас на левым рукаве — дзяржаўны сцяг нашай краіны. Зразумела, на вас будуць глядзець, вас будуць пазнаваць, па вашых выніках будуць меркаваць, што вы сабой уяўляеце», — звярнуўся да камандаў Андрэй Раўкоў.

Ён упэўнены, што ўзровень падрыхтоўкі дазваляе разлічваць на высокія месцы на кожным конкурсе.

«Задача адна: сціснуць волю, нервы, эмоцыі і ўнутранае трапятанне ў кулак, у энергію, якая, выліўшыся, дасць вынік. Гэта вельмі складана, я гэта разумею, ведаю па сабе, таму шчыра жадаю вам здолець перамагчы гэтыя эмоцыі і без страху і сумненняў ісці да намечанай мэты», — даў наказ байцам міністр абароны.

Кіраўнік абароннага ведамства адзначыў, што балельшчыкаў у камандаў — цэлая краіна, бо ўся Беларусь будзе з хваляваннем сачыць за выкананнем гэтай вучэбна-баявой задачы. Андрэй Раўкоў уручыў сцяг Беларусі, які будзе суправаджаць байцоў на працягу ўсіх спаборніцтваў, капітану каманды.

Армейскія міжнародныя гульні пройдуць з 3 да 17 жніўня на тэрыторыі дзесяці дзяржаў. Два конкурсы пройдуць у Беларусі — «Снайперскі рубеж» і «Палярная зорка».

«Конкурс сярод падраздзяленняў спецыяльнага прызначэння «Палярная зорка» праводзіцца на АрМГ упершыню, пройдзе ён ў Брэсце. Усяго мы ўдзельнічаем у 18 конкурсах на тэрыторыі сямі краін. Па зразумелых прычынах не ўдзельнічаем у спаборніцтвах горных падраздзяленняў ці экіпажаў марскіх караблёў», — паведаміў **начальнік галоўнага ўпраўлення баявой падрыхтоўкі Узброеных Сіл, кіраўнік беларускай дэлегацыі Андрэй НЕКРАШЭВІЧ.**

У V Армейскіх міжнародных гульнях будуць удзельнічаць 32 краіны.

«Што пераможам, сумненняў няма. Традыцыйна мы спаборнічаем на ўзроўні ўзброеных сіл Расіі, Кітая, Індыі, Ірана з іх мільённымі арміямі і мільярднымі бюджэтамі. Летась практычна ва ўсіх конкурсах мы займалі прызавыя месцы, а ў некаторых — і першыя, як у «Снайперскім рубяжы», — разважае Андрэй Некрашэвіч.

Начальнік галоўнага ўпраўлення баявой падрыхтоўкі выказаў упэўненасць, што Армейскія міжнародныя гульні — у першую чаргу праверка прафесійнага майстэрства вайскоўцаў, іх высокага маральнага духу, які дапаможа заняць высокія месцы. Сам факт удзелу ў АрМГ сведчыць, што ты — прафесіянал.

«Жорсткі адбор, сам працэс якога вымушае ўдасканаліць падрыхтоўку вайскоўцаў — у шыхт становяцца толькі найлепшыя. Нездарма АрМГ параўноўваюць з Алімпіядай. Дзякуючы ўдзелу ў іх мы ўздымаем прэстыж не толькі Узброеных Сіл, але і краіны цалкам. Нават дзяржавы, якія раней толькі здагадваліся пра існаванне Беларусі, цяпер, паверце, з велізарнай павагай ставяцца да нас, вывучаюць наш досвед», — расказаў Андрэй Некрашэвіч.

Галоўнай задачай нашых байцоў ён лічыць дэманстрацыю майстэрства.

«Каб усе ведалі і бачылі, што з пазіцыі сілы з намі лепш не размаўляць», — падвёў вынік генерал.

Варвара МАРОЗАВА.

Каманда з Беларусі будзе спаборнічаць з іншымі ўдзельнікамі «Танкавага біятлона — 2019» на танках Т-72Б3, якія ўжо ў хуткім часе адправяцца на палігон «Алабіна». «Этап падрыхтоўкі да спаборніцтваў у нас пачаўся з 13 мая і цяпер ужо завяршыўся. За гэты час нашы хлопцы паказалі свае навыкі на вельмі добрым узроўні. Мы аналізавалі свой і чужы досвед мінулых гадоў і вучыліся на ім. Зараз каманда цалкам гатовая і, як заўсёды, настроена толькі на перамогу», — адзначыў старшы прапаршчык, капітан каманды, камандзір танка Сяргей МІХНО.

Спаборніцтвы праводзяцца па маршруце з натуральнымі і штучнымі перашкодамі, баявымі дарожкамі, участкамі для стральбы і будуць складацца з наступных этапаў: індывідуальная гонка, паўфінал і фінал этапу «Эстафета».

Ва ўсіх папярэдніх спаборніцтвах па танкавым біятлоне першае месца даставалася Расіі, на другім месцы пабывалі Кітай, Казахстан і Арменія. Беларусь двойчы брала «бронзу».

Танкавы біятлон — гэта прыкладныя спаборніцтвы паміж танкавымі экіпажамі ў мастацтве кіравання танкам і дакладнасці стральбы з асноўнай і дадатковай зброі. Першы танкавы біятлон адбыўся ў 2014 годзе.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.

Фота БелТА.

Адпачынак з «Лясным аганьком»

Дзіцячыя забаўкі: сабакі-сапёры, стральба з вінтоўкі і пераноска параненых

Тэматыка трэцяй змены ў аздараўленчым лагеры «Лясны аганёк», што пад Стайкамі, — «Вясёлка творчасці і натхнення». З 15 ліпеня да 1 жніўня дзеці аздараўляюцца, дыхаюць сасновым паветрам, займаюцца квілінгам, спевамі і танцамі і вучацца сябраваць. Дзевяць з васямнаццаці дзён яны будуць адпачываць побач з незвычайнымі суседзямі — палатачным лагерам «Юнармейцы Белай Русі». На ўрачыстым адкрыцці палатачнага лагера дзеці пазнаёміліся паміж сабой, а таксама з ваеннаслужачымі вайсковай часці № 31802 2-й інжынернай брыгады і мінна-пошукавымі сабакамі.

Двайны сняданак і вялікія ўчынкі

Усяго ў лагеры 128 дзяцей ад 7 да 14 гадоў. Палова з іх — спартсмены, якія трэніруюцца ў любое надвор'е два разы на дзень, а 13 чалавек — профільны атрад юнармейцаў, якія жывуць у палатках і вядуць напаўспартанскае жыццё.

— Хоць жывуць яны па-асобку, аднак час бавяць разам. Палатачнікі могуць займацца ў нашых гуртках, а дзеці з нашай змены ахвотна ўдзельнічаюць у вайсковай падрыхтоўцы. Мы стараемся дапамагчы малым знайсці сябе ў калектыве, навучыцца стаяць за атрад, рабіць агульную справу, зацікавіць іх, каб ніхто не мог сказаць, што яму сумна, — кажа **Наталля ШАЎЛІС, начальнік лагера «Лясны аганёк».** — А яшчэ мы стараемся, каб у іх хапала сіл на ўсё. Некаторыя не любяць, скажам, тварожную запяканку ці кашу, таму нашы павары гатуюць фактычна двайныя сняданкі — абавязкова падаюць яшчэ і запечаны бутэрброд, каб пераборлівыя не заставаліся галоднымі.

Палатачны лагер на тэрыторыі «Лясного аганька» арганізуецца трэці год запар. Сёлетнія яго ўдзельнікі — вучні цэнтра дапрызыўнай падрыхтоўкі сталічнай школы № 133.

— Некаторыя дзеці ў нашым лагеры — з сем'яў, дзе існуюць пэўныя праблемы. Каб дзяцей не забралі са звыклага асяродку, я бяру іх з сабою ў лагер, — гаворыць **Герман МАСЛЯНКОЎ, начальнік цэнтра дапрызыўнай падрыхтоўкі.** — Як паказвае практыка, за гэты час яны паспяваюць змяніцца. Дарэчы, з самых заўзятых «злачынцаў» вырастаюць, як правіла, сапраўдныя патрыёты, якія першымі ідуць на амбразуру і здольныя на вялікія ўчынкі. Іх проста трэба паставіць на правільныя рэйкі, як цягнік, і яны пацягнуць хутка і якасна. Галоўнае — быць з імі шчырым. Летась мама аднаго хлопчыка сказала, што яго паводзіны пасля лагера значна палепшыліся, сёлета зноў прывяла. Разам з тым і са спакойнага з выгляду хлопчыка можа вырасці «мальчыш-плахіш».

«Сокал», Эліс і Кабан

Пасля ўрачыстага адкрыцця дзеці адправіліся на футбольнае поле, дзе ім расказалі пра работу сапёраў і далі пакарыстацца металашукальнікам.

— Кеўларавы касцюм «Сокал» з браніраванымі ўстаўкамі валодае супрацьасколачным дзеяннем — спыняе асколкі, якія пры вазе шэсць грамаў на дыстанцыі 15 метраў ад месца выбуху ляцяць з хуткасцю 600 метраў за секунду, — расказаў **старшы лейтэнант Эдуард ЛЯМЗІН, начальнік гуманітарнай групы разміравання 2-й інжынернай брыгады,** дэманструючы абсталяванне і абмундзіраванне сапёраў.

Аўчарка Эліс паказала, як яна шукае міны і слухаецца кінолага. «Безумоўная паслухмянасць — такая жа важная якасць, як і востры нюх, бо па полі сабака павінна ісці след у след за сапёрам, каб не падарвацца на міне», — удакладняе Эдуард Лямзін. А паплечнік Эліс па мянушцы Кабан затрымаў умоўнага злачынцу. «Самая галоўная праблема пасля — адцягнуць сабаку ад затрыманага», — жартуе ён.

Нафатаграфаваўшыся на памяць з сабакамі і прымерыўшы касцюмы, дзеці разбіліся на групы і разышліся на заняткі па пяці тэматычных станцыях. Юнармейцы дапамагалі праводзіць заняткі і раілі, як трэба рабіць.

На першай пазіцыі стралялі па мішэнях-шарыках з макета вінтоўкі.

— У нас усе ў школе страляюць. Я пачаў у чацвёртым класе, — кажа **юнармеец Андрэй ГОЦІН.** — Гэта цікава, мы на спецыяльным факультатыве і гісторыю Узброеных Сіл яшчэ вывучаем.

— Мне здавалася, гэта не маё, пакуль не паклікалі паспрабаваць, — смяецца **Ганна ДАВЫДОВІЧ, удзельніца абласных і гарадскіх спаборніцтваў па стральбе.** — Я захапілася адразу. Калі не нервуюся, добра страляю.

На другой станцыі дзеці працавалі з картамі.

— Мы вывучалі мясцовасць, даведаліся, што азначае штрыхпункцір, як падпісваецца глыбіня азёр, дзе шукаць масты... А яшчэ, калі зараджалі патроны ў магазін, яны шчоўкалі, як у фільмах, — радасна дзеліцца набытымі ведамі **Арына ПАЛІТЫКА з першага атрада,** якая ў лагер прыязджае другі год і адразу ўключаецца ў заняткі на трэцяй пляцоўцы — па пераносцы параненага.

На наступнай пляцоўцы юнармейцы паказвалі, як разбіраць і збіраць аўтамат. А за апошнім сталом дзеці вучыліся зараджаць патроны ў магазін.

Нават дождж не спыніў імпэт падлеткаў — з-пад адкрытага неба заняткі перанеслі ў альтанку, а ахвотных пастраляць было проста за вушы не адцягнуць ад вінтовак, і ніякі дождж ім не перашкаджаў. Дарэчы, пакуль чарговая партыя малых назірала, як правільна пераносіць пацярпелага, міма прабеглі спартсмены, якія адправіліся на трэніроўку, нягледзячы на дрэннае надвор'е. Дысцыпліна ёсць дысцыпліна...

Ірына СІДАРОК, фота аўтара.

«...ЗДАБЫЦЬ СОЛЬ ЛЮБОЙ ЦАНОЙ!»

ГІСТОРЫЯ АДНОЙ ПАРТЫЗАНСКАЙ СПЕЦАПЕРАЦЫІ

Гэты аповед даслаў нам у рэдакцыю наш даўні чытач з Вялікай Бераставіцы Міхаіл Маскальчук. Ён запісаны са слоў яго бацькі, Васіля Маскальчука, які ваяваў у атрадзе 130-й Петрыкаўскай партызанскай брыгады. Дзейнічала яна на тэрыторыі тагачаснай Палескай вобласці, якая ўключала ў сябе частку сучасных Міншчыны і Гомельшчыны.

Азіраючыся на падзеі тых часоў, мы ведаем, што партызаны праводзілі шмат аперацый па знішчэнні нямецкіх гарнізонаў, падрыве стратэгічных камунікацый, эшалонаў ворага, якія ішлі на фронт. Але не менш важнай задачай быў пошук харчавання. У тым ліку — і для мірных жыхароў, якія хаваліся ў лесе ад карнікаў у сямейных лагерах.

...У той час лясныя байцы і мірныя жыхары пакутавалі ад недахопу солі. А дастаць яе было вельмі цяжка. І гэта добра разумелі фашысты і паліцаі.

І вось у канцы жніўня 1943 года выклікае мяне і майго сябра-аднавяскоўца Мікалая Чарткова камандзір атрада Рыгор Кравец. У камандзірскай зямлянцы за сталом сядзяць камандзір атрада, начальнік штаба Платон Астапчук, камісар Аляксандр Макейчык і наш камандзір узвода Сумбат Арзуманян.

«Сядайце, хлопцы», — паказаў начальнік штаба на дзве дубовыя калодкі, якія служылі імправізаванымі крэсламі.

«Чаму мы выклікалі менавіта вас? — прамовіў ён. — Справа ў тым, што ў нас у атрадзе і ў найбліжэйшым сямейным лагеры амаль скончылася соль. Пакутуюць і нашы байцы, і мірныя жыхары, асабліва дзеці. Становішча склалася катастрафічнае... Нашы разведчыкі высветлілі, што ў пасёлку Сосны, там, дзе была гаспадарка «10 год БССР», каля вузкакалейкі на вуліцы засталася нявыкарыстаная калійная соль, якую якраз прывезлі напярэдадні вайны. Канешне, гэта не выйсце, але за няйменнем лепшага трэба здабыць яе».

(Будаўніцтва гэтай вузкакалейкі апеў у паэме «Над ракой Арэсай» Янка Купала, які прыязджаў у пачатку 30-х гадоў на будоўлю.)

«Напярэдадні мы пасылалі падводу з двума нашымі байцамі па гэтую соль, але аперацыя не ўдалася. Байцы нашага атрада на вузкай лясной дарозе сутыкнуліся з абозам з немцамі і паліцаямі. Распачаўся хуткацечны бой, адзін наш баец загінуў. Другі здолеў адарвацца ад карнікаў і прыйшоў у атрад. Згубілі добрага каня. Але, галоўнае, мы страцілі дасведчанага байца... Таму мы тут падумалі разам з кіраўніцтвам атрада і вырашылі цалкам змяніць план па здабычы солі, — задуменна вымавіў камандзір атрада, устаючы з-за стала. — Тыдзень таму выведка нашай брыгады разам з байцамі зладзіла на дарозе Любань — пасёлак Сосны засаду. Удалося захапіць штабную машыну з аховай на матацыклах. Былі захоплены важныя дакументы. А галоўнае — мы ўзялі ў палон важную птушку, оберштурмфюрара СС. У яго знайшоўся ўнікальны дакумент з гербавай пячаткай, падпісаны самім рэйхсфюрарам СС Гімлерам.

У ім значылася наступнае: «Прад'яўнік гэтага дакумента мае права ездзіць па ўсіх дарогах рэйха, а таксама ў забароненыя і ахоўныя зоны. У цывільнай форме або ў ваеннай, з любым пасажырам або без яго. А таксама мае права праверкі дакументаў ва ўсіх асоб, у тым ліку гестапа, СД, паліцыі бяспекі, СС, ахоўнай паліцыі. Дадзенай асобе ўсе абавязаны аказваць усялякае садзейнічанне і дапамогу па яе патрабаванні. Дзейнічае пры наяўнасці фотаздымка».

«Я думаю, хлопцы, вы здагадваецеся, да чаго мы вядзем гэтую размову, — прамовіў Рыгор Кравец, уважліва паглядзеўшы на мяне з Мікалаем. — Па-першае, вы абодва з вёскі Камуна, а гэта за сем кіламетраў ад пасёлка Сосны. Вы добра ведаеце гэтыя месцы, у тым ліку і вузкакалейку, якая ідзе і праз вашу вёску. А таксама тутэйшы лес і падыходы да населеных пунктаў. У пасёлку Сосны і ў бліжэйшай вёсцы Кузьмічы хапае немцаў і паліцаяў, і соль не так проста ўзяць. Ёсць толькі адзін шанц, і яго трэба выкарыстоўваць!»

«Мы ведаем з камандзірам, што Мікалай нядрэнна размаўляе па-нямецку, — уступіў у размову начальнік штаба Платон Астапчук. — Дык вось, на час аперацыі, Мікалай, табе давядзецца стаць немцам, оберштурмфюрарам СС. Гэта вельмі небяспечна, але іншага выйсця ў нас проста няма!»

«Нашы партызанскія ўмельцы ўклеяць твой фотаздымак замест нямецкага ў пасведчанне. Думаю, да раніцы справяцца», — прагаварыў камісар атрада Аляксандр Макейчык.

«А цяпер папрашу слухаць мяне ўважліва! — прамовіў камандзір. — Заўтра з раніцы камандзір узвода Сумбат Арзуманян з разведчыкамі праводзяць вас за апошняе баявое ахоўванне. Там Мікалай пераапранецца ў нямецкую форму оберштурмфюрара СС, Васіль — у форму старшага паліцэйскага. І далей пойдзеце самі. Па нашых звестках, на гэты час і ў пасёлку Сосны, і ў вёсцы Кузьмічы ў асноўным паліцаі. Немцаў мала. Усё, хлопцы, трэба рабіць хутка і аператыўна, каб немцы не паспелі праверыць дакументы оберштурмфюрара больш дасканала. У СД і гестапа працуюць не прафаны, а вельмі дасведчаныя кадры. Ну а падводу з канём здабудзеце на месцы. Будзеце дзейнічаць па абстаноўцы. Удачы вам, сынкі, — дадаў камандзір, абняўшы нас. — І яшчэ: у сутычкі з немцамі і паліцаямі пастарайцеся не ўступаць, хіба толькі ў экстранным выпадку!»

Як толькі развіднела, мы ўжо мы былі за апошнім баявым ахоўваннем.

«Хутка пераапранацца!» — загадаў начальнік выведкі Сцяпан, дастаючы з рэчавага мяшка акуратна выгладжаную нямецкую і паліцэйскую форму.

Мікалай хутка апрануў форму оберштурмфюрара СС. Сцяпан падаў яму дакументы, яшчэ раз дбайна праверыў іх, працягнуў парабэлум з дзвюма запаснымі абоймамі, замацаваў на мундзіры жалезны крыж.

Я апрануўся ў чорную паліцэйскую форму. На грудзі павесіў нямецкі аўтамат MP40. Камандзір узвода падаў мне яшчэ нямецкую вінтоўку Mauser і цяжкі штык-нож да яе.

«Ну, здаецца, усё, — прамовіў Сцяпан. — І глядзіце ўважліва, каб вас не пазналі мясцовыя паліцаі, бо вы родам з тых мясцін... Нашы хлопцы будуць увечары чакаць вас на гэтай дарозе. Калі спытаюць пароль, адкажаце: «Ленінград». Пароль будзе дзейнічаць тры дні».

Камандзір узвода Сумбат Арзуманян. (Здымак зроблены ў партызанскім атрадзе падчас вайны.)

Асцярожна, на досвітку, зайшлі мы ў пасёлак з паўночнага боку. Пастукалі тройчы ў акно крайняй хаты. На падваконні з левага боку ў блакітным гаршку стаяў сталетнік.

«Усё добра, расліна на месцы, можна заходзіць», — прамовіў Мікалай, папраўляючы эсэсаўскую фуражку.

Адчыніўшы нам дзверы, маладая дзяўчына падалася назад, не пазнаўшы Мікалая і мяне. Але супакоілася і запаліла свечку. Гэта была наша сувязная Настасся. Мікалай коратка расказаў пра будучую аперацыю.

«Немцаў у пасёлку няшмат. Яны сядзяць у асноўным у дзотах на ўскраіне пасёлка. Астатнія разам з паліцаямі знаходзяцца ў будынку былой бальніцы. Усе паліцаі ў асноўным з вёскі Кузьмічы, яны не павінны вас пазнаць. І яшчэ. Па даносе паліцая сёння на могілках будуць расстрэльваць тры сям'і, якія нібыта дапамагалі партызанам. Трэба неяк іх выратаваць! — са слязамі на вачах папрасіла нас Насця. — Гэта будзе а восьмай раніцы».

«Трэба тэрмінова дужы конь з трывалым возам, — прамовіў Мікалай. — І неадкладна!»

«А вунь праз вуліцу паліцай жыве са сваёй каханкай, у яго дужы жарабец, і больш за тое, воз на гумавых колах!» — хутка прамовіла дзяўчына, з надзеяй гледзячы на нас.

«Хутка ідзём да яго, Вася!» — дастаючы парабэлум з кабуры, прамовіў Мікалай.

...І вось ён, узвёўшы затвор парабэлума, грукае нагой у зачыненыя дзверы. Сонны паліцай у трусах, трымаючы ў адной руцэ вінтоўку, адчыняе засаўку. Заходзім у хату. На ложку, падабраўшы пад сябе коўдру, сядзіць каханка, спалохана гледзячы на нямецкага афіцэра...

«Шнэль, шнэль, хутка ўставаць! — крычыць Мікалай. — Наўкол пасёлка бандыты, а яны песцяцца ў ложку. Хутка запрагай каня, паедзеш з намі, шнэль, рус швайн!» — крычаў Мікалай, падганяючы паліцая.

Праз 10 хвілін мы ўжо пад'язджалі да могілак. Там убачылі страшную карціну. Паліцаі і некалькі немцаў пад стогадовай сасной пілі гарэлку, на даматканым ручніку ляжала закуска. А каля дрэва стаяў кулямёт з запраўленай стужкай, побач ляжалі вінтоўкі. Тры маладыя жанчыны са сваімі дзецьмі капалі сабе магілу. Паліцаі, рагочучы, падганялі іх...

Мікалай дастаў парабэлум і стрэліў у паветра. Паліцаі, убачыўшы нямецкага оберштурмфюрара СС, ускочылі, пахапалі зброю, выцягнуліся.

«Што тут адбываецца, адказваць неадкладна?!» — крыкнуў па-нямецку Мікалай.

«Будзем бандытаў расстрэльваць», — адказаў старшы паліцай.

«Я не бачу тут ніякіх бандытаў. Тут жанчыны і дзеці. Усе бандыты ў лесе, якіх вы ловіце да гэтага часу і не можаце злавіць... Вось гадзіну таму на нас напала па дарозе банда, мы ледзь адбіліся, згубілі ахову, машыну давялося кінуць... А вы тут у пасёлку акапаліся, загарадзіліся дзотамі і займаецеся п'янствам і жанчынамі, а не ловіце бандытаў. Вас усіх трэба павесіць за невыкананне загаду рэйхсфюрара СС. Усе маладыя і здаровыя, мусяць працаваць на дабро вялікай Германіі, бандытаў павінны знішчаць. А вы ўсё робіце наадварот, расстрэльваеце дзяцей і жанчын, а дакладваеце ў Берлін, што знішчаеце партызан. Карацей, зараз вы бераце рыдлёўкі і ламы і ідзяце са мной. Жанчыны з дзецьмі таксама ідуць з намі. Усю зброю скласці ў воз. Можа, вы ўсе правакатары, падасланыя партызанамі. Яшчэ трэба з вамі разабрацца!» — крычыць Мікалай, размахваючы пісталетам і падганяючы паліцаяў.

Я на ўсякі выпадак узвёў затвор аўтамата, падрыхтаваў запасныя ражкі, непрыкметна ўставіў запалы ў гранаты.

Праз гадзіну воз быў загружаны.

«Усім разабраць сваю зброю і адпраўляцца ў пасёлак. Праз тры дні я зноў прыеду сюды. Усе вы будзеце праверaны на адданасць Германіі службай СД і гестапа! — крычаў Мікалай. — Усе палонныя пойдуць з намі на зборны пункт, а затым будуць адпраўлены на працу ў Германію. Угнаенне адвозім пад надзейную ахову ў склад».

Чорны жарабец крануў з месца цяжкі воз. Жанчыны, падлеткі і дзяўчынкі пайшлі з намі. Праз хвілін дзесяць выехалі на дарогу Сосны — Буда. Раптам на пыльнай дарозе з боку вёскі Буда паказаўся нямецкі грузавік, поўны ўзброеных эсэсаўцаў. Рэзка затармазіўшы, спыніўся каля нас. З кабіны выйшаў нямецкі обер-лейтэнант і запатрабаваў дакументы. З кузава на нас пагрозліва глядзелі чорныя зрэнкі дулаў аўтаматаў.

Мікалай паказаў обер-лейтэнанту сваё пасведчанне, той толькі казырнуў і пажадаў дарогі без партызан.

Праз дзве гадзіны, не сустрэўшы больш нікога на дарозе, не лічачы двух п'яных паліцаяў, якія везлі звязанае парася, мы ўжо паварочвалі ў такі доўгачаканы, родны, выратавальны лес... Праўда, парася Мікалай, паказаўшы сваё пасведчанне, канфіскаваў на карысць Германіі.

Васіль Маскальчук разам з унучкай Людмілай. Верасень 2017 года.

Праз пятнаццаць хвілін мы ўжо былі каля вузкакалейкі на паўднёвым баку пасёлка. Каля закінутага склада, сярод высокай травы бачылася горка чырвонага ўгнаення.

«Усе ідзём сюды», — звярнуўся Мікалай да паліцаяў, трымаючы на баявым узводзе парабэлум.

«Тэрмінова ўсё ўгнаенне да апошняй пясчынкі загрузіць у гэты воз! Вы ведаеце, лайдакі, што бандыты ў лясах выкарыстоўваюць угнаенне замест солі, а вы ў гэтым ім дапамагаеце. Ужо даўно трэба было прыбраць яго ў склад і выставіць ахову, а вы замест гэтага займаецеся рабаўніцтвам, п'янствам і жанчынамі. Я заўтра асабіста пазваню рэйхсфюрару СС у Берлін і далажу яму, чым вы тут займаецеся. Дарэчы, я маю на гэта поўнае права...»

Мікалай падазваў нямецкага яфрэйтара, дастаў з кішэні пасведчанне, падпісанае Гімлерам, і загадаў чытаць услых.

«Я думаю, цяпер да мяне і майго памочніка, які, дарэчы, сёння выратаваў мяне ад бандытаў, больш ніякіх пытанняў не будзе?» — прамовіў Мікалай, хаваючы парабэлум у кабуру.

Яшчэ праз гадзіну мы даехалі да апошняга баявога ахоўвання нашай партызанскай зоны. Ужо цямнела. Раптам з густога ельніку пачуўся голас камандзіра разведкі Сцяпана:

«Назавіце ваш пароль».

«Свае. Наш пароль — Ленінград».

«Што за людзі з вамі?» — спытаў Сцяпан.

«Нашы людзі, выратаваныя ад расстрэлу», — адказалі мы.

«Добра. Хутка пераапранацца і сыходзім на базу!» — прамовіў Сцяпан.

...Мікалай Чарткоў па-геройску загінуў восенню 1943 года. Знаходзячыся ў разведцы, Мікалай і яго баявы таварыш нарваліся на засаду ў вёсцы Вялікія Сялюцічы Петрыкаўскага раёна. Сябры прынялі няроўны бой. Абодва былі цяжка паранены і захоплены ў палон. Таварыша Мікалая замучылі на месцы. Мікалая даставілі на станцыю Капцэвічы. Яго падверглі нечалавечым катаванням. Хлопца замучылі да смерці, так ад яго нічога і не дабіўшыся.

Доўга мы нічога не ведалі пра яго. Але ўвесну 1944 года ўзялі ў палон немца, які прысутнічаў пры допыце Мікалая. Ён нам усё і расказаў пра апошнія хвіліны жыцця героя...

Извещение об открытом аукционе по продаже права проектирования и строительства капитального строения (ул. Волковича, ул. Коммунальная) в городе Гродно 20 августа 2019 года

№ п/п	Месторасположение земельного участка	Площадь земельного участка, га, срок аренды	Целевое назначение земельного участка	Начальная цена предмета аукциона, рублей	Сумма задатка, рублей	Расходы на подготовку документации для проведения аукциона, рублей	Наличие обременений	Ориентировочный размер убытков, причиняемых изъятием земельного участка и сносом расположенных на нем объектов недвижимости, рублей
1	2	3	4	5	6	7	8	9
1.	г. Гродно, ул. Волковича, в районе домов №№ 5, 7, 7а	0,2418, 10 лет	Многоквартирный 2—3-этажный жилой дом с мансардой (12—16 квартир) и помещениями обслуживания на 1-м этаже	61 157,26	6 115,72	7022,78	Снос зданий, сооружений, зеленых насаждений, попадающих под пятно застройки	214 863,32
2.	г. Гродно, ул. Коммунальная, 32	1,6990, 5 лет	Группа блокированных жилых домов (30—35 квартир) 2-этажных с мансардным этажом со встроенно-пристроенными гаражами и благоустройством территории	61 759,77	6 175,98	12 077,45	Снос зданий, сооружений, зеленых насаждений, попадающих под пятно застройки	1 128 676,00

Предмет аукциона: право проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений) на предоставляемом земельном участке, на котором находятся объекты, подлежащие сносу.

Аукцион проводится в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 г. № 462.

Основные требования по проектированию и строительству объекта и условия предоставления земельного участка указаны в земельно-кадастровой и иной документации, подготовленной для проведения аукциона.

Сведения о наличии инженерных коммуникаций на указанных земельных участках и их характеристики содержатся на планово-картографических материалах в составе земельно-кадастровой документации.

Инженерное развитие инфраструктуры застраиваемой территории участков осуществляется в соответствии с техническими условиями на инженерно-техническое обеспечение соответствующего объекта, выданными эксплуатирующими и согласующими организациями (согласно перечню, установленному Гродненским горисполкомом).

Аукцион состоится 20 августа 2019 года в 12.00 в здании горисполкома по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1.

Участниками аукциона могут быть юридические лица или индивидуальные предприниматели. В аукционе допускается участие на стороне покупателя консолидированных участников – двух и более индивидуальных предпринимателей, юридических лиц.

Для участия в аукционе необходимо:

внести задаток не позднее 14 августа 2019 года, в размере, указанном в графе 6 таблицы, перечисляемый на расчетный счет BY24 AKBB 3012 0000 4181 0400 0000 в филиале № 400 ГОУ ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Гродно, БИК AKBBBY21400, УНП 590727594, получатель – коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости».

Организатор аукциона: коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости».

Лицо, желающее принять участие в аукционе, представляет:

заявление на участие в аукционе;

документ, подтверждающий внесение суммы задатка, с отметкой банка;

подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах) установленной формы, включающее обязательство по уплате в соответствии с законодательством штрафных санкций и иные требования;

дополнительно представляется: индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования; представителем индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность; представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии устава и свидетельства о государственной регистрации юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица; представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык; консолидированными участниками для участия в аукционе представляются также оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе.

При подаче документов на участие в аукционе представители индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

При подаче документов уполномоченное лицо, которое будет представлять на аукционе стороны договора о совместном участии в аукционе и подписывать протокол о результатах аукциона, (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, и доверенности, выданные индивидуальными предпринимателями, юридическими лицами, заключившими договор о совместном участии в аукционе. Представителем уполномоченного лица дополнительно предъявляется доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, либо документ, подтверждающий полномочия должностного лица.

Прием документов, консультации по вопросам участия в аукционе и ознакомление с имеющейся документацией осуществляются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, кабинет № 407, в рабочие дни **с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00. с 22 июля по 14 августа 2019 года**.

Торги в отношении земельных участков проводятся при условии наличия двух или более участников. Победителем торгов признается участник, предложивший наиболее высокую цену.

Если заявление на участие в аукционе подано только одним участником, аукцион признается несостоявшимся и земельный участок предоставляется такому лицу при его согласии с внесением платы за право заключения договора аренды земельного участка в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов.

Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона обязан:

- внести плату за право заключения договора аренды земельного участка (часть платы – в случае предоставления Гродненским горисполкомом рассрочки ее внесения);

- возместить Гродненскому горисполкому расходы по подготовке документации для проведения аукциона;

- возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в т. ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. Информация о данных затратах, порядке их возмещения доводится до сведения участников аукциона до его начала при заключительной регистрации под роспись и оплачивается по предоставляемому организатором аукциона счету-фактуре.

Оплата стоимости за право заключения договора аренды земельного участка осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли.

После внесения платы за право заключения договора аренды земельного участка Гродненский горисполком заключает с победителем аукциона либо единственным участником несостоявшегося аукциона договор на реализацию права проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений).

Всем желающим предоставляется возможность ознакомления с землеустроительной и градостроительной документацией по земельным участкам (в том числе с характеристиками расположенных на земельных участках инженерных коммуникаций и сооружений (при их наличии) и условиями инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории). Осмотр земельных участков на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время.

Телефоны для справок в Гродно: **(0152) 72-05-37, 72-00-10**. Адрес сайта: **www.grodno.gov.by**

Центр Промышленной Оценки
- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

Извещение о проведении повторного аукциона

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703
Продавец	ОАО «Банк БелВЭБ», 220004, г. Минск, пр-т Победителей, 29

Предмет аукциона

Лот №	Наименование	Начальная цена с НДС 20 %
1	**Изолированное помещение** (Административное помещение) общей площадью 176,3 кв. м, инвентарный номер 100/D-118656 по адресу: г. Брест, ул. Московская, 332/3Б-2	244 058,19 бел. руб.
2	**Изолированное помещение** (Административное помещение) общей площадью 64,9 кв. м, инвентарный номер 100/D-118655, по адресу: г. Брест, ул. Московская, 332/3Б-1	90 518,04 бел. руб.
3	**Изолированное помещение** (Административное помещение) общей площадью 122,8 кв. м, инвентарный номер 100/D-118659, по адресу: г. Брест, ул. Московская, 332/3Б-3	170 353,24 бел. руб.
4	**Квартира (число комнат – 3)** общей площадью 83,2 кв. м, инвентарный номер 342/D-182936, расположенная по адресу: Гомельская обл., г. Светлогорск, ул. Интернациональная, 46-42	51 497,71 бел. руб.
5	**Квартира (число комнат – 1)** общей площадью 38,8 кв. м, инвентарный номер 342/D-182937, расположенная по адресу: Гомельская обл., г. Светлогорск, ул. Интернациональная, 46-14	22 869,79 бел. руб.
6	**Квартира (число комнат – 3)** общей площадью 72,6 кв. м, инвентарный номер 200/D-138816, расположенная по адресу: г. Витебск, ул. Генерала Ивановского, 24-1	82 634,47 бел. руб.
7	**Квартира (число комнат – 3)** общей площадью 72,8 кв. м, инвентарный номер 200/D-159962, расположенная по адресу: г. Витебск, ул. Генерала Ивановского, 26-1	82 634,41 бел. руб.

С подробной информацией по предмету аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона WWW.CPO.BY

Задаток 10 % от начальной цены лота в белорусских рублях перечисляется на р/с № BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа — ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи: 10 рабочих дней после проведения аукциона

Условия оплаты предмета аукциона

В течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении аукциона по лотам №№ 1—3 опубликовано в газете «Звязда» 14.05.2019 г., по лотам №№ 4—7 в газете «Звязда» 05.06.2019 г.

Аукцион состоится 16.08.2019 в 12.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 14.08.2019 до 17.00 по** указанному адресу**.**

Тел.: +375 17 280-36-37; 8044-704-92-06. E-mail: auction@cpo.by

---

Центр Промышленной Оценки
- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

Извещение о проведении повторных электронных торгов

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703
Продавец	ОАО «Банк БелВЭБ», 220004, г. Минск, пр-т Победителей, 29
Оператор ЭТП	ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б
Адрес ЭТП	**www.ipmtorgi.by**

Предмет электронных торгов
Спецтехника, расположенная по адресу: Минская обл., Солигорский р-н, д. Хоростово

Лот №	Наименование	Начальная цена с учетом НДС 20%
1	Опрыскиватель Харди Коммандер Плюс, заводской № 007332, 2000 г. в.	22 796,32 бел. руб.
2	Пресс-подборщик Клаас Квадрант 1150, заводской № 04500237, 2001 г. в.	26 013,90 бел. руб.
3	Сеялка кукурузная Кляйне Мультикорн 6 р, заводской № 16-С40-012, 2000 г. в.	20 693,60 бел. руб.
	Спецтехника, расположенная по адресу: г. Орша	
4	Прицепный Опрыскиватель Амазоне UX 5200, заводской № ГЧ00000657, 2008 г. в.	62 200,58 бел. руб.
	Спецтехника, расположенная по адресу: Минская обл., Минский р-н, пос. Луговая Слобода	
5	Грузовой седельный тягач Renault Magnum 2010 г. в., кузов VF617GKA000020331, 2010 г. в.	55 038,56 бел. руб.

Задаток 10 % от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи	**15** (пятнадцать) рабочих дней после электронных торгов

Условия оплаты предмета электронных торгов

В течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлен регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение в течение **3 (трех)** рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

Предыдущее извещение о проведении электронных торгов опубликовано в газете «Звязда» 14.05.2019 г.

Дата, время и место проведения электронных торгов: 16.08.2019 в 13.00 (первый лот) каждый следующий лот с интервалом 10 минут, на ЭТП «ИПМ-Торги» (**www.ipmtorgi.by)**

Дата и время окончания приема документов (предварительная регистрация) на ЭТП ipmtorgi.by: 14.08.2019 до 17.00

Контактные телефоны	+375 17-280-36-37; +375 44-704-92-06. E-mail: auction@cpo.by

---

Центр Промышленной Оценки
- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

Извещение о проведении повторного аукциона

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703
Продавец	ОАО «Трест № 26 Железобетонмонтаж», г. Минск, ул. Харьковская, д. 15, 3-й этаж Тел.: +375 17 256 90 09

Предмет аукциона
Имущество, реализуемое одним лотом по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Барыкина, 254Ж

№ лота	Наименование (Назначение)	Общ. пл., кв. м	Инв. номер
1	Здание мастерской техобслуживания (Здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей (в т. ч. автомобильные заправочные и газонаполнительные станции) Составные части: пристройка, сарай, ограждение (а), площадка, дорожка (б)	764,5	350/С-88090
	Электрическая кран-балка подвесная, инв. номер по бухучету 728	-	-

Сведения о земельном участке: общ. пл. 0,2085 га, предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для эксплуатации и обслуживания здания мастерской техобслуживания.

Начальная цена с НДС 20 %: 90 846,00 белорусского рубля BYN
Шаг аукциона: 4 542,30 белорусского рубля BYN

Имущество, реализуемое одним лотом по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Барыкина, 254Г

2	Здание неотапливаемого материального склада (Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ) Составные части и принадлежности: Пристройка, сарай, ограждение (а), площадка, дорожка (б), площадка, дорожка (в)	947,6	350/С-88082
	Вышка осветительная (мачта), инв. номер по бух. учету 50155	-	-
	Очистные сооружения (Сооружение специализированное коммунального хозяйства)	127,0	350/С-188233

В состав лота входит крытая площадка для хранения баллонов (2 шт.)

Обременения: частичная аренда

Сведения о земельном участке: общ. пл. 0,6088 га, предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для эксплуатации и обслуживания здания неотапливаемого материального склада. Ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные в охранных зонах электрических сетей, площадь 0,0500 га

Начальная цена с НДС 20 %: 143 623,03 белорусского рубля BYN
Шаг аукциона: 7 181,15 белорусского рубля BYN

Имущество, реализуемое одним лотом по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Барыкина, 254В

3	Открытый склад металла № 1 (Сооружение специализированное складов, хранилищ) Составные части и принадлежности: площадка, подкрановая балка, погрузочно-разгрузочная площадка, рельсы, лоток для электрокабеля, ворота (Е), ограждение (Ж), площадка, дорожка (И).	10146,7	350/С-187388
	Здание теплопункта (Здание специализированное энергетики) Составные части и принадлежности: отмостка	42,9	350/С-88096
	Кран консольный козловой, инв. номер по бух. учету 920	-	-

В состав лота входит следующее имущество: площадка для погрузки а/машин № 1/вес 1,9 тн (эстакада), площадка для погрузки а/машин № 1/вес 1,4 тн (эстакада), бадья для бетона бн-1 (1 шт.), кондуктор для монтажа полурам (1 шт.) (2,7 т) баллон газовый (1 шт.), лом ж/б. изделий 191,0 т, лом ж/б. изделий 47,030 т, металлоконструкции у1, у5-у7,а19 7,929 т, оснастка б/у 4,270 т, паронит 3 мм пон-б 1500*2000 1 лист, решетка 1 шт., сотовый поликарбонат sunnex (12 м,16 мм прозр.) 1 лист

Сведения о земельном участке: общ. пл. 1,6690 га, предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для эксплуатации и обслуживания открытого склада металла № 1, здания теплопункта. Ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные в охранных зонах электрических сетей, площадь 0,0275 га

Начальная цена с НДС 20 %: 155 553,75 белорусского рубля BYN
Шаг аукциона: 7 777,69 белорусского рубля BYN

Имущество, реализуемое одним лотом по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Барыкина, 254

4	Открытый склад металла № 2 (Сооружение специализированное складов, хранилищ) Составные части и принадлежности: Площадка (А), колонны (опоры) (Б), ограждение (В)	1 014,0	350/С-188232
	Кран-балка, инвентарный номер по бух. учету 729	-	-

Сведения о земельном участке: общ. пл. 0,1069 га предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для эксплуатации и обслуживания открытого склада металла № 2

Начальная цена с НДС 20 %: 22 680,00 белорусских рублей BYN
Шаг аукциона: 1 134,00 белорусских рублей BYN

Имущество, реализуемое одним лотом по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Барыкина, 254Д

5	Канализационно-насосная станция (Здание специализированное коммунального хозяйства) Составные части и принадлежности: подвал, ограждение (а), площадка, дорожка (б), площадка, дорожка (в)	31,9	350/С-88092

Сведения о земельном участке: общ. пл. 0,0464 га предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для эксплуатации и обслуживания канализационно-насосной станции. Ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные в охранных зонах электрических сетей, площадь 0,0390 га, а земельные участки, расположенные в зонах санитарной охраны водопроводных сооружений, площадь 0,0464 га

Начальная цена с НДС 20 %: 12 768,00 белорусских рублей BYN
Шаг аукциона: 638,40 белорусского рубля BYN

Порядок ознакомления: Каминский Павел Иванович, ликвидатор, 8029-659-14-39, Дриневский Виктор Васильевич, начальник производственного участка, тел. +375(29) 603 49 02

С подробной информацией по предмету аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона WWW.CPO.BY

Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней после проведения аукциона

Срок оплаты: при цене продажи предмета аукциона в сумме до 49 999,99 BYN – срок оплаты не более 10 (десяти) дней со дня заключения договора купли-продажи. При цене продажи предмета аукциона в сумме свыше 50 000,00 BYN – срок оплаты не более 30 (тридцати) дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи

Порядок оформления участия в аукционе и результатов торгов: аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совмина РБ от 8 января 2013 г. № 16 «О некоторых вопросах продажи имущества ликвидируемого юридического лица». К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление с приложением всех необходимых документов, зарегистрированное в журнале регистрации заявлений на участие в торгах, и заключившие с организатором торгов договор о задатке. С подробной информацией о перечне предоставляемых документов, образцами заявления на участие в аукционе и договора о задатке, а также правилами проведения аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона **www.cpo.by**

В случае признания торгов несостоявшимися в связи с тем, что заявление на участие в них было подано только одним участником либо для участия в них явился только один участник, возможна продажа предмета торгов этому участнику по начальной цене, увеличенной на 5 %

Затраты на организацию и проведение торгов возмещаются организатору аукциона участником торгов, с которым заключается договор купли-продажи в течение 5 дней со дня проведения торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 25.06.2019 г.

Дата, место и время проведения аукциона	**09.08.2019** в 11.00 по адресу**: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»**
Дата, место и время окончания приема документов	**07.08.2019** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»**
Контактные телефоны	+375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. E-mail: auction@cpo.by

Памяць

«КАБ ТАЯ ВАЙНА СТАЛА АПОШНЯЙ...»

Мы жывём у мірны час, нам складана ўявіць усе жахі Вялікай Айчыннай, але ж памяць пра яе захоўваць павінны. І адказнасць за гэта шмат у чым кладзецца на плечы настаўнікаў.

У нашай школе ў апошнія гады, апроч гісторыі Другой сусветнай вайны ў цэлым, вывучаецца ўдзел у ёй землякоў, даследуюцца старонкі жыцця вёскі і ваколіц перыяду вайны, з тым каб сабраная інфармацыя паслужыла стварэнню «Кнігі Памяці» Гродзенскай вобласці, краязнаўцы праводзяць пошукавыя работы ў рамках праекта «І памяць сэрца гаворыць».

Школа брала ўдзел і ў раённым праекце «75 дзён да Перамогі». Падчас гэтай акцыі Сцяг Перамогі і Гільза Памяці ганарова перадаваліся паміж сельскімі выканаўчымі камітэтамі Дзятлаўскага раёна, у момант перадачы нашы найлепшыя піянеры Андрэй Губко, Любава Ляўшук, Анастасія Сідорчык неслі ганаровую варту.

Але ж галоўнае, што вучні разумеюць важнасць і неабходнасць акцыі «Як жывеш, ветэран?», шэфствуюць над Марыяй Станіславаўнай Галавач і Аляксандрай Паўлаўнай Пачук, якіх прымусова вывозілі ў Германію, прымаюць удзел у добраўпарадкаванні помнікаў ахвярам фашызму і загінулым землякам, разам з бацькамі запісваюць успаміны сваіх бабуль і дзядуль.

Па двух кірунках працавалі школьнікі і ў рамках рэспубліканскага конкурсу «Не меркне летапіс перамог». Адна група вывучыла гісторыю стварэння і баявы шлях 556-га Беластоцкага Чырванасцяжнага стралковага палка 169-й Рагачоўскай стралковай дывізіі, які пад камандаваннем падпалкоўніка П. В. Качуры ў ліпені 1944 года вызваляў вёску Дварэц і яе ваколіцы, другая, працуючы над школьным праектам «Зорачкі на карце раёна», наведвала магілы савецкіх салдат, партызан і ахвяр фашызму, спаленыя вёскі Дзятлаўшчыны, пасля чаго была створана адмыслоўая карта, дзе пазначаны гэтыя аб'екты.

Для таго ж нашы педагогі распрацавалі сеткавы праект «Рго-Дворец», які дапамог наладзіць сувязі з іншымі ўстановамі адукацыі, у ваколіцах якіх ёсць населеныя пункты з назвай Дварэц, азнаёміцца з іх гісторыяй, у тым ліку перыяду Вялікай Айчыннай вайны. Турыстычны савет, распрацоўваючы маршруты экскурсій, уключае ў іх мясціны, якія павінны наведаць усе жыхары і госці нашай краіны. У прыватнасці, незабыўныя ўражанні засталіся ў навучэнцаў пасля наведвання мемарыяльных комплексаў «Трасцянец», «Хатынь», «Лінія Сталіна», музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Да 75-годдзя вызвалення краязнаўцы школы падрыхтавалі памятны буклет «Вызваленне ў кожны дом» і даставілі іх жыхарам вёсак.

...Гэта, вядома ж, далёка не поўны пералік праведзеных мерапрыемстваў, якія закліканы сфарміраваць у падрастаючага пакалення правільныя маральныя якасці, замацаваць надзею, што тая вайна была апошняй у гісторыі нашага народа, што жыццё ў наступнікаў будзе больш шчаслівае, чым у дзядоў і прадзедаў.

Ірына ЛЯЎШУК,
намеснік дырэктара
ДУА «Дварэцкая сярэдняя школа», Дзятлаўскі раён.

Я зноў выбіраю «Звязду»

«ЯНА БЫЛА МНЕ ЯК МАЦІ...»

Газету «Звязда» чытаю з пяцідзясятых гадоў мінулага стагоддзя. Тады, пераросткам, я хадзіў у школу, і помню, як старшыня калгаса, выклікаўшы ў кантору, прапанаваў мне насіць пошту ў нашу вёску Пятровічы... Колькі ж у мяне было радасці! Я (?!) буду мець працу і так званыя працадні, потым — нейкія грошы...

Такім чынам, з раніцы я вучыўся ў школе, а вечарам, нягледзячы на надвор'е, разносіў лісты, пасылкі, газеты...

Самай любімай у маіх аднавяскоўцаў была «Звязда», і сам я чытаў яе, можна сказаць, запоем. А калі ўжо ў час службы ў войску трапіў за мяжу...

Мая газета прыходзіла ў Венгрыю ў бібліятэку нашага авіяпалка. Помню, бібліятэкарка так і казала: заходзь, маўляў, прыйшла твая «Звязда». У цяжкія часы маёй службы (у краіне тады ішла вайна) яна і сапраўды была мне як маці, як Айчына, як глыток палескай вады. Чытаў я яе ад радка да радка, а найболей — вершы на роднай мове. Там, за мяжой, я пазнаёміўся з творамі маладога паэта Петруся Макаля.

Потым чытаў «Звязду», калі вучыўся ў БДУ, калі хварэў, калі настаўнічаў, калі стаў пенсіянерам. Калі не хапала грошай на падпіску, хадзіў у бібліятэку.

...Газета цяпер ветэранка, ёй ужо больш за сто, але яна, хочацца верыць, вечная, бо трымаецца роднай мовы, бо працягвае гаварыць з людзьмі, нагадвае маладым пра страшную трагедыю Вялікай Айчыннай вайны, расказвае аб працоўных буднях. Сёння, як некалі.

Аляксей РУСІНОВІЧ,
в. Пятровічы,
Светлагорскі раён.

❍ Ад рэдакцыі і, што называецца, у рубрыку «Добрыя навіны»

Падчас Вялікай Айчыннай «Звязда» друкавалася на Любаншчыне, на востраве Зыслаў. Якраз там яна адзначала і свой стагадовы юбілей, прычым адзначала па-свойску, па-сямейнаму, хто-ніхто з супрацоўнікаў прыехаў на свята з дзецьмі і...

Цуды здараюцца: менавіта тады і там карэспандэнт нашай газеты Вераніка Пуставіт пазнаёмілася з сынам нашай жа Вольгі Мядзведзевай...

Днямі і, спадзяёмся, пад шчаслівай «Звяздой» Вераніка і Цімафей пабраліся шлюбам, што, вядома ж, соладка-соладка і горка-горка!

Гэта мы да таго, каб маладыя аніколі не стаміліся цалавацца. З усімі адсюль наступствамі...

Балючае пытанне

ТАБЛЕТКІ АДНЫ І ТЫЯ Ж,

А ВОСЬ ЦЭНЫ — РОЗНЫЯ...

У нашай краіне шмат людзей пажылога ўзросту, на долю якіх выпалі вельмі цяжкія выпрабаванні. Тыя, каму цяпер каля 80 і болей, пазналі ўсе жахі вайны, не мелі дзяцінства, змалку і вельмі шмат працавалі. Дык адкуль тады быць здароўю?

Каб падтрымліваць яго, хоць бы тое, што засталося, нам даводзіцца звяртацца да медыкаў, купляць шмат лекаў. І пры гэтым пастаянна сутыкацца з тым, што цэны на іх у розных аптэках розныя. А найбольш абурае (думаем, не толькі нас — многіх людзей Беларусі), што за медпрэпараты і айчыннай, і нават замежнай вытворчасці даражэй даводзіцца плаціць у аптэках унітарнага прадпрыемства «Белфармацыя». Таблеткі «Тамсулазін», напрыклад, там каштуюць больш за 17 рублёў (а ў камерцыйнай аптэцы — каля 12 рублёў), уколы «Хай-флекс» адпаведна — больш за 72 рублі (за адзін) і 64 рублі і г. д. Можна прыводзіць многа прыкладаў, розніца ў 10, 20 і больш працэнтаў — гэта, згадзіцеся, вельмі істотна. А між тым «Белфармацыя» з'яўляецца дзяржаўнай арганізацыяй, якая, здавалася, больш, чым іншыя (у тым ліку прыватныя кампаніі), павінна клапаціцца пра здароўе людзей.

Са сродкаў масавай інфармацыі мы ведаем, што цяпер па гэтым пытанні прымаецца шмат розных рашэнняў, праводзіцца многа мерапрыемстваў, але пакуль да лепшага мала што мяняецца. А таму пенсіянеры — ветэраны працы, мусіць, не хутка яшчэ ўздыхнуць з палёгкай.

Вельмі спадзяёмся, што адказныя за ўзнятае пытанне прачытаюць гэты ліст на старонках газеты і нешта выракшаць на нашу карысць.

Сужэнцы КАРПОВІЧЫ,
падпісчыкі «Звязды» з больш чым 50-гадовым стажам,
г. Віцебск.

Чалавек — чалавеку

Першым заявіў гэта Карскі

...Ёсць кнігі, ёсць людзі-асобы, якія ўражваюць, уплываюць на жыццё, пэўна, кожнага, хто да іх прычыніўся. Для мяне гэта «Беларусы» Яўхіма Карскага.

Аўтар, стваральнік закончанага вучэння пра нашу мову, літаратурную творчасць і фальклор, нарадзіўся ў сям'і настаўніка пачатковых класаў у 1861 годзе непадалёк ад Гародні. Неўзабаве сям'я перабралася на Наваградчыну, затым на Міншчыну.

Вучыўся юнак у Мінскай духоўнай семінарыі, але ж там не затрымаўся і ён паступіў у Нежынскі гісторыка-філалагічны інстытут. Выхадзец з народнай глыбінкі, ён засвоіў асаблівасці маўлення сваіх землякоў, артыкуляцыю гукаў, народную гаворку... Між тым ні ў Польшчы, ні ў Расійскай імперыі існаванне асобнага беларускага народа і яго мовы не прызнавалася нават навукоўцамі. Яны лічылі, што гэта — адзін з рускіх «говоров» і не больш за тое... Аднак у 1893 годзе ў друку з'яўляецца магістарская дысертацыя «К истории звуков и форм белорусской речи», дзе Яўхім Карскі на аснове даследаванняў пісьмовых крыніц, вуснай народнай творчасці, побыту народа і палеаграфіі на ўвесь свет заявіў: «Белорусское наречие должно считаться самостоятельным: совокупность его характерных черт не повторяется ни в одном славянском языке».

Яшчэ студэнтам інстытута, скарыстаўшы звесткі розных даследчыкаў і свае «Беларускія песні сяла Бярозаўка Навагрудскага павета Мінскай губерні», Яўхім Карскі падрыхтаваў «Обзор звуков и форм белорусской речи». Менавіта ён вызначыў уласцівыя толькі ёй фанетычныя асаблівасці: мяккі гук [дз'] — *дзеці, дзяўчынка* («хіба ліхо озме ліцвіна, щоб він не дзэкнув» — цытуе ўкраінцаў Яўхім Карскі); гук [дж] — *дождж*; мяккі гук [ц] — *цяпер, цяпло*; цвёрдае [ч]; прыстаўное «в» — *вокны*; аканне. Малады філолаг прызнаваў, што для больш дакладнай перадачы гукаў беларусам нестае графічных знакаў.

Даследчык разглядаў увесь комплекс пытанняў, звязаных з народнай творчасцю, побытам, літаратурай. На падставе глыбокага параўнальна-гістарычнага аналізу ён навукова абгрунтаваў: беларусы — асобны і самастойны народ, які мае сваю гісторыю, арыгінальную культуру, самасвядомасць, багатыя традыцыі і звычаі, уласную адметную мову, якая, паводле Карскага, сфарміравалася да канца XVI стагоддзя.

Ёсць мова — жыве народ. Яўхім Карскі — нястомны даследчык гэтага жыцця, які пабываў усюды, дзе жылі беларусы — выдаў свае даследаванні пад аднайменнай назвай — «Беларусы». У трох фаліянтах з этнаграфічнай картай беларускага племені і картай беларускай гаворкі доктар філалогіі, акадэмік Расійскай акадэміі навук падае навукова акрэсленае месца пражывання беларусаў паводле маўлення, побыту і г. д. Такім чынам, менавіта Карскім былі прадвызначаны межы беларускай дзяржавы.

